УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ДУБРОЎСКІ МІХАІЛ ГЕОРГІЕВІЧ

**ПАЭТ, ДРАМАТУРГ, ПЕРАКЛАДЧЫК, ПЕДАГОГ**

**22 ВЕРАСНЯ (3 КАСТРЫЧНІКА) 1897 Г. – 11 ВЕРАСНЯ 1983 Г.**

**ФОНД № 357**

**ВОПІС № 1**

**1909–1982**

МІНСК 2020

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 357**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ М.Г. ДУБРОЎСКАГА | 1-27 | 1-5 |
| 1.1. | ВЕРШЫ, БАЙКІ І ІНШ. | 1-11 | 1-2 |
| 1.2. | П'ЕСЫ, ДЫСЕРТАЦЫЯ І ІНШ. | 12-17 | 2-3 |
| 1.3. | ПЕРАКЛАДЫ | 18-27 | 3-5 |
| 2. | ПЕРАПІСКА | 28-56 | 5-8 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ М.Г. ДУБРОЎСКАГА | 28-34 | 5 |
| 2.2 | ПІСЬМЫ М.Г. ДУБРОЎСКАМУ | 35-42 | 5-6 |
| 2.3. | ПІСЬМЫ М.Г. ДУБРОЎСКАМУ АД УСТАНОЎ | 43-56 | 6-8 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ М.Г. ДУБРОЎСКАГА | 57-86 | 8-11 |

## Прадмова

**Дуброўскі (пры нараджэнні Маслакоў) Міхаіл Георгіевіч** нарадзіўся 22.09 (03.10) 1897 г. ў в. Казелле Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці). У 1900 г. разам з бацькамі пераехаў у в. Каранец Клімавіцкага павета, дзе прайшло яго дзяцінства і юнацтва. У 1909 г. Міхаіл Георгіевіч скончыў царкоўна-прыходскую школу, а праз два гады – Дамамерыцкае двухкласнае вучылішча. У 1912 г. паступіў у Клімавіцкае вышэйшае пачатковае вучылішча, але хутка быў выключаны, бо не меў сродкаў, каб заплаціць за навучанне. Пасля гэтага служыў вучнем у Хатовіцкім валасным праўленні, а вясною 1913 г. вярнуўся ў в. Каранец, дзе пражыў каля трох гадоў: быў пастухом, падзёншчыкам памешчыка. У 1915–1916 гг. працаваў раз’язным паштальёнам у г. Харкаве. У 1916 г. прызваны на службу ў царскую армію. Прымаў удзел у падзеях Кастрычніцкай рэвалюцыі ў г. Смаленску і на Клімаўшчыне. У 1918–1919 гг. супрацоўнічаў у газеце “Известия Климовичского уисполкома”, быў старшынёй валвыканкама ў Клімавіцкім павеце. У 1919 г. накіраваны ў Гомельскі губвыканкам для працы па ўмацаванні Савецкай улады ў паўночных паветах Чарнігаўскай губерні, якія адышлі да Гомельшчыны. У 1919–1921 гг. загадваў Гомельскім перасыльным пунктам, ваенным аддзелам Бялынкавіцкага валвыканкама і адначасова вучыўся на настаўніцкіх курсах. У 1921–1922 гг. Дуброўскі – настаўнік пачатковых класаў і інструктар валаснога аддзела народнай адукацыі ў Касцюковіцкім павеце. У 1922–1925 гг. – студэнт Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В.Я. Брусава ў г. Маскве. У 1925–1926 гг. – навуковы супрацоўнік літаратурнай камісіі Інбелкульта. З 1926 г. да 1941 г. жыў пераважна ў г. Маскве. Працаваў у рэдакцыі газеты “Гудок”, літаратурным рэдактарам ва Усесаюзным радыёкамітэце і ў выдавецтве. У 1937–1941 гг. настаўнічаў у сярэдняй школе і адначасова займаўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі, літаратуры, гісторыі (ІФЛІ) імя М.Г. Чарнышэўскага. У 1941 г. эвакуіраваўся ў Башкірыю, дзе быў выкладчыкам ў педвучылішчы. У сакавіку 1942 г. прызваны ў армію і ў ліпені таго ж года дэмабілізаваны. З 1942 г. да 1945 г. М.Г. Дуброўскі на педагагічнай працы ў Маскоўскай вобласці і ў г. Маскве. У 1945–1947 гг. – загадчык кафедры беларускай літаратуры і мовы Брэсцкага педінстытута. У 1949–1950 гг. – выкладчык сярэдняй школы ў г. Маскве. З 1950 г. – старшы выкладчык Гродзенскага педінстытута. Член СП БССР з 1959 г. Кандыдат філалагічных навук (1960). З 1960 г. на пенсіі.

Узнагароджаны медалямі “За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941– 1945 гг.”, “За доблесный труд в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.”, “Ветеран труда” (1980).

Першыя вершы пад прозвішчам Дуброўскі[1] на рускай мове былі надрукаваны ў 1918 г. у газеце “Известия Климовичского уисполкома”. Аўтар вершаў, баек, артыкулаў, апавяданняў, крытычных артыкулаў і

[1] Да 1918 г. насіў прозвішча Маслакоў, якое змяніў на прозвішча свайго “прашчура” П.Я. Дуброўскага

нарысаў. З 1924 г. пачаў друкавацца на беларускай мове (часопісы “Змаганне”, “Маладняк”, газета “Чырвоная змена”). Пасля вайны друкаваўся ў газетах “Гродненская правда” і “Сельская новь” (Гродна), “За радзіму” (Магілёў), “Заря” (Брэст), “Калгасная праўда” і часопісе “Полымя”. Напісаў лібрэта “Уласнай рукой” (разам з П.П. Шастаковым) да оперы М.М. Чуркіна “Вызваленне працы”. Друкавалася ў 1928–1929 гг. у газеце “Гудок” (г. Масква). Быў членам “Маладняка”, УАПП, “Кузніцы”. Шмат гадоў пісьменнік аддаў даследаванню сатырычнага напрамку ў беларускай літаратуры, вывучэнню творчасці народнага пісьменніка БССР К. Крапівы. Займаўся перакладамі з англійскай, італьянскай, нямецкай, рускай і інш. мовы на беларускую. У перакладзе М.Г. Дуброўскага асобным выданнем выйшла паэма А. Уайльда “Балада Рэдынгскае турмы”. Зрабіў шмат перакладаў для тэатра.

Міхаіл Георгіевіч Дуброўскі памёр 11.09.1983 г. у г. Гродна і пахаваны на гарадскіх могілках.

Дакументы Міхаіла Георгіевіча Дуброўскага паступілі ў чэрвені 1984 г. ад паэтэсы Д.І. Бічэль-Загнетавай. У пачатку 1970-х гадоў частка архіва М.Г. Дуброўскага была знішчана ў час пажару ў яго доме. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс №1 у колькасці 86 адзінак захоўвання (597 дакументаў) за 1909–1982 гг.

Вопіс складаецца з 3-х раздзелаў.

Першы раздзел “Рукапісы М.Г. Дуброўскага” ўключае тры падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па тэматыцы, а ўнутры – па храналогіі за 1942–1982 гг. У першы падраздзел увайшлі вершы, вершаваныя апавяданні, байкі, у другі – п’еса “За правое дело”, лібрэта “Уласнай рукой”, дысертацыя “Белорусская советская сатира 1917–1925 годов” і інш., у трэці – пераклады М.Г. Дуброўскага з англійскай, італьянскай, нямецкай, польскай, рускай мовы і інш.

Другі раздзел “Перапіска” складаецца з трох падраздзелаў: “Пісьмы М.Г. Дуброўскага”, “Пісьмы М.Г. Дуброўскаму”, “Пісьмы М.Г. Дуброўскаму ад устаноў” справы ў якіх сістэматызаваны па храналогіі за 1937–1982 гг.

Трэці раздзел “Дакументы да біяграфіі М.Г. Дуброўскага” уключае асабістыя дакументы за 1909–1980 гг., дакументы службовай дзейнасці за 1926–[1970-я гг.], юбілейныя віншаванні М.Г. Дуброўскага за 1967–[1982 гг.], фатаграфіі М.Г. Дуброўскага індывідуальная [1970-я гг.] і ў групе з неўстаноўленымі асобамі [1940-я гг.] і інш.

Прадмову склала Г.Б. Багамолава
Вядучы архівіст
10.01.2020

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ФОНД № 357

ВОПІС № 1
1909-1982

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ

ад 16.06.2020

№ 6

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

## 1. РУКАПІСЫ М.Г. ДУБРОЎСКАГА

### 1.1. ВЕРШЫ, БАЙКІ І ІНШ.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | "Адамаў дуб" (1945), "Возмездие" (1943), "Дзед Рыгор і дзеці" (1947), "Дорогой Ильича" (1946), "Лён" (1945), "Маёй радзімы сын"(1945), "Напярэдадні сяўбы" і інш. Вершы. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1954-1982 | 36 | 32 | |
| 2 | "Адвечная песня" (1929), "Весна" (1932), "Вызваленне"(1939), "З імем Леніна" (1925), "Май идёт лучистый, величавый ..." (1918), "О Ленине" (1937), "Памяці Парыжскай камуны"(1927) і інш. Вершы. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1968-1980 | 42 | 40 | |
| 3 | "Воину красной армии", "Квітнець у вяках", "Мира требую", "Мы здабылі жыццё на вякі", "На гонях Беларусі", "Рэвалюцыяй прызваны", "У згодзе і брацтве" і інш. Вершы. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1972-1980 | 25 | 25 | |
| 4 | "Віцька - герой", "Гарыць, пылае ленінскі касцёр!", "Год семдзесят трэці", "З імем Леніна", "Ідзе камунізм", "Настала часіна", "Пяю Беларусь" і інш. Вершы. Некаторыя з праўкай Д.І. Бічэль-Загнетавай. Выразкі з газет "Гродненская правда", "Гродненский химик", "Сельская новь" | 1972-1982 | 41 | 41 | |
| 5 | "Ветеран", "Ідзе камунізм", "Лотас і хваля", "Назваць адзін другога - "свой"!", "Народ у Саветы людзей выбірае", "Савецкі май", "Я з ёй заўсёды" і інш. Вершы. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1979-1982 | 27 | 27 | |
| 6 | "Балада пра заставу Віктара Усава", "Да Нёмана", "Наш Гродна" (у сааўтарстве з А.П. Цыхуном). Вершы. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1978-1979 | 10 | 10 | |

* * *

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | "Сябры мае! Прыйшоў жаданы час..."="У ясны дзень"="Чаму той песні тут не панаваць?". Вершаваная прамова на вечары, прысвечаным выпуску студэнтаў ў Гродзенскім педінстытуце. Варыянты. Машынапіс | 1954 | 4 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 8 | "Ліст да майго сябра Міхася Васілька", частка 1-ая, "Ліст да майго начальніка Аляксея Карпюка", частка 2-ая. Вершаванае апавяданне пра некаторыя моманты жыцця М.Г. Дуброўскага. Машынапіс | 1955, 1966 | 12 | 2 | |
| 9 | "Пра героя Цішку і сабаку Лыску". Вершаванае апавяданне. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай, машынапіс | 1973 | 8 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 10 | "Крот, Грак і Ласка", "Ластаўкі і Вароны", "Лёс Чубаткі", "Удаў і Бегемот". Байкі. Варыянты. Машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай, выразкі з газет | 1960-1980 | 13 | 13 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | М.Г. Дуброўскі. "Айчыны верныя сыны", "Край легендаў", "Нашай долі слава". Тэксты песень на музыку Ю. Талесніка, У. Шыркевіча і інш. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1961-1981 | 7 | 7 | |
| | **1.2. П'ЕСЫ, ДЫСЕРТАЦЫЯ І ІНШ.** | | | | |
| 12 | "За правое дело". П'еса. Аўтарызаваны машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1942 | 31 | 1 | |
| 13 | "Уласнай рукой". Лібрэта (з П.П. Шастаковым) беларускай оперы М.М. Чуркіна "Вызваленне працы". Машынапіс. Прыкладзена пісьмо [Есакову А.А.] з просьбай выказаць думку наконт гэтага твора. Л. 41 | 1955 | 41 | 2 | |
| 14 | "Уласнай рукой". П'еса паводле лібрэта П.П. Шастакова беларускай оперы М.М. Чуркіна "Вызваленне працы". | 1971 | 33 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс | | | | |
| | * * * | | | | |
| 15 | "Белорусская советская сатира 1917-1925 годов". Дысертацыя.<br>Машынапіс з праўкай, пераплёт | 1959 | 345 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Справаздача "К итогам приёмных экзаменов в гродненский педагогический институт" і памятка "Товарищу Радюку Трофиму Семёновичу, секретарю Гродненского горкома КПСС" М.Г. Дуброўскага аб стане і вывучэнні беларускай мовы і літаратуры ў школах і інстытутах.<br>Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1952, 1953 | 8 | 2 | |
| 17 | "Паэзія Шчучына". Агляд творчасці маладых аўтараў.<br>Машынапіс.<br>Прыкладзена копія пісьма рэдакцыі газеты "Савецкая вёска" (г. Шчучын) М.Г. Дуброўскаму з падзякай за агляд. Л.3 | 1966 | 3 | 2 | |
| | **1.3. ПЕРАКЛАДЫ** | | | | |
| 18 | В. Шэкспір. "Віндзорскія жартаўніцы". Камедыя ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з англійскай мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка з праўкай | 1973 | 100 | 1 | |
| 19 | Г.У. Лангфэла. "Песня пра Гаявату",<br>О. Уайльд. "Балада Рэдынгскай турмы".<br>Паэмы ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з англійскай мовы 1925-1929 гг.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка з нязначнай аўтарскай праўкай | 1978 | 34 | 2 | |
| 20 | І.Р. Бэхер. "Хлопчык",<br>А.Ч. Суінберн. "Песня ў часіну парадку",<br>П.Б. Шэллі. "Песня да брытанцаў" і інш.<br>Вершы і санеты ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з англійскай, італьянскай, нямецкай мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка, машынапіс, выразкі з газет | 1967-1980 | 11 | 12 | |
| 21 | Л. Леўчэў. "Дарога з усходу і дарога на ўсход".<br>Паэма ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з балгарскай мовы. | 1979 | 6 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс | | | | |
| 22 | Т. Кляшторны. З паэмы "Следы дорог",<br>Р.К. Сабаленка. "Полесье".<br>Паэмы ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з беларускай мовы.<br>Машынапіс.<br>Да аднаго з перакладаў прыкладзена запіска С.Г. Дуброўскага ў часопіс "Неман". Л. 5 | [1970-я гг.]-1980 | 10 | 2 | |
| 23 | А.П. Астрэйка. "Моя Москва",<br>П.У. Броўка. "Будет гордый урожай", "Весна", "Уже сентябрь",<br>С.І. Грахоўскі. "Первая любовь",<br>Я. Купала. "Две девушки",<br>М.Танк. "Элеватор", "Лён" і інш.<br>Вершы ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з беларускай мовы<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка, машынапіс | [1970-я гг.]-1980 | 11 | 11 | |
| 24 | П. Кручанюк. "Каля брамкі, ля плятня",<br>Д. Кугульцінаў. "У кожнага ў душы ў нас",<br>М. Турсун-Задэ. "Дзве хусткі" і інш.<br>Вершы ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з калмыцкай, малдаўскай і інш. мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка, машынапіс | [пач. 1970-х гг.]-1979 | 6 | 6 | |
| 25 | М. Асіпчук. "Песня партызанкі",<br>У. Бранеўскі. "Я сын змучанай Польшчы",<br>А. Міцкевіч. "Байдары", "Бура" і інш.<br>Вершы ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з польскай мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка, машынапіс | [1970-я гг.]-1982 | 11 | 14 | |
| 26 | А.І. Недагонаў. "Флаг над сельсаветам". Паэма ў перакладзе М.Г. Дуброўскага з рускай мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка з нязначнымі праўкамі | 1947 | 41 | 1 | |
| 27 | М.І. Алігер. "Настаўніцам",<br>С.А. Васільеў. "Радасць",<br>М. Горкі. "Песня пра Буравесніка",<br>С.У. Міхалкоў. "Рака і дрыгва",<br>С.П. Шчыпачоў. "Пра любоў" і інш.<br>Вершы і інш. у перакладзе М.Г. Дуброўскага з рускай мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс перакладчыка, машынапіс, выразка з газеты | [1970-я гг.]-1981 | 13 | 16 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

## 2. ПЕРАПІСКА

### 2.1. ПІСЬМЫ М.Г. ДУБРОЎСКАГА

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 28 | Пісьмы да родных | 1974, 1980 | 2 | 2 | |
| 29 | Пісьмо В.У. Быкаву.<br>На адвароце - верш М.Г. Дуброўскага - аўтограф | 1982 | 1 | 1 | |

* * *

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 30 | Пісьмо М.Г. Дуброўскага ў Дзяржвыд БССР М.М. Клімковічу з пералікам перакладаў камедый У. Шэкспіра, над якімі ён працуе | 1947 | 1 | 1 | |
| 31 | Пісьмо М.Г. Дуброўскага ў рэдакцыю газеты "Чырвоны сцяг" (мястэчка Краснаполле Магілёўскай вобласці) з аўтабіяграфічнымі звесткамі | 1959 | 4 | 1 | |
| 32 | Пісьмо М.Г. Дуброўскага Гродзенскаму аддзяленню таварыства па распаўсюджанні палітычных і навуковых ведаў М.М. Кулінковічу з заўвагамі на лекцыю М.С. Вілюгі "Почему люди говорят на разных языках?" | 1960 | 1 | 1 | |
| 33 | Пісьмы М.Г. Дуброўскага ў рэдакцыі газет "Літаратура і мастацтва", "Сельская новь", часопіс "Полымя" і інш. па пытаннях публікацыі яго твораў і інш. | 1967-1982 | 5 | 5 | |
| 34 | Пісьмы М.Г. Дуброўскага галоўнаму рэжысёру і дырэктару тэатра імя Я. Коласа. | 1973 | 2 | 2 | |
| 35 | Пісьмо М.Г. Дуброўскага ў Беларускае аддзяленне Літфонда СССР з падзякай за дапамогу ў лячэнні | 1982 | 1 | 1 | |

### 2.2 ПІСЬМЫ М.Г. ДУБРОЎСКАМУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 36 | Пісьмы і віншавальныя паштоўкі П.Л. Абрамава (Расія) | 1975-1977 | 11 | 10 | |
| 37 | Пісьмы В.У. Быкава, А.І. Мальдзіса | 1974, 1982 | 3 | 2 | |
| 38 | Пісьмы і віншавальныя паштоўкі Ф.Д. Іванова, В. Машкоўскага, Ф.І. Самойлы, М.І. Семянкова, М.Ф. Янушэвіча і інш. | 1953-1980 | 32 | 27 | |
| 39 | Пісьмы і віншавальныя паштоўкі Я.Ц. Кабачэнкі (Расія). | 1969-1972 | 21 | 18 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Да пісьмаў ад 19.08 і 22.08.1969 г. прыкладзены адказ М.Г. Дуброўскага | | | | |
| 40 | Пісьмы М.А. Карпечанкі | 1982-1983 | 5 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 41 | Віншавальныя паштоўкі ад родных (сына Івана, сястры Ганны) | 1969-1980 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 42 | Пісьмы і віншавальныя паштоўкі вучняў Гібуліцкай васьмігадовай школы (Гродзенскі раён), краязнаўцаў Бялынкавіцкай сярэдняй школы (Касцюковіцкі раён Магілёўскай вобласці) і інш. | 1967-1975 | 6 | 5 | |
| | **2.3. ПІСЬМЫ М.Г. ДУБРОЎСКАМУ АД УСТАНОЎ** | | | | |
| 43 | Пісьмы прэзідэнта АН БССР І.З. Сурты, Дзяржвыд БССР М.Г. Дуброўскаму наконт выдання камедыі У. Шэкспіра ў яго перакладзе на беларускую мову. Арыгіналы і машынапісная копія | 1937, 1949-1953 | 5 | 5 | |
| 44 | Пісьмы рэдакцыі газеты "Гродненская правда" М.Г. Дуброўскаму па службовых пытаннях | 1962-1976 | 11 | 11 | |
| 45 | Пісьмы рэдакцыі газет "Гомельская праўда", "Звязда", "Літаратура і мастацтва", часопісаў "Неман", "Полымя" і інш. М.Г. Дуброўскаму з адмовамі надрукаваць яго вершы, пераклады і інш. | 1966-1983 | 13 | 13 | |
| 46 | Пісьмы рэдакцыі раённай газеты "Сельская новь" (г. Гродна) М.Г. Дуброўскаму з паведамленнямі аб пасяджэннях літаратурнага аб'яднання і інш. | 1971-1982 | 19 | 19 | |
| 47 | Пісьмы рэдакцый маскоўскіх часопісаў "Дружба народов", "Смена" і інш. М.Г. Дуброўскаму з просьбай даслаць ім свае кнігі з аўтографам | 1978-[пач. 1980-х гг.] | 7 | 4 | |
| 48 | Пісьмы загадчыка рэдакцыі БелСЭ І.У. Саламевіча і рэдактара Л.М. Малінінай, дырэктара літаратурнага музея Я. Купалы А.М. Кулакоўскага і інш. з просьбай напісаць успаміны пра Я. Купалу, адказаць на пытанні да энцыклапедычнага слоўніка "Янка Купала" і інш.<br>Прыкладзены чарнавікі адказу М.Г. Дуброўскага на гэтыя пытанні. Лл. 3-4 | 1980-1981 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 49 | Пісьмы праўлення СП БССР М.Г. Дуброўскаму па службовых пытаннях | 1947-1976 | 9 | 9 | |
| 50 | Пісьмы галоўных рэжысёраў тэатра імя Я. Коласа А.Б. Скібнеўскага і С.С. Казіміроўскага, загадчыка літаратурнай часткі У. Ганчарова М.Г. Дуброўскаму пра яго пераклад У. Шэкспіра "Віндзорскія жартаўніцы".<br>Арыгіналы і машынапісная копія | 1954, 1973 | 3 | 3 | |
| 51 | Пісьмы Беларускага аддзялення Літфонда СССР, Гродзенскага абласнога аддзялення СП БССР М.Г. Дуброўскаму па службовых пытаннях | 1968-1983 | 7 | 7 | |
| 52 | Пісьмы Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР, Брэсцкага абласнога ваеннага камісарыята М.Г. Дуброўскаму з адказамі на яго запыты. | 1954, 1975 | 2 | 2 | |
| 53 | Пісьмы Магілёўскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея, рэспубліканскага дома народнай творчасці і інш. М.Г. Дуброўскаму аб дакументах па яго дзейнасці на Магілёўшчыне ў 1920-я гады і інш. | 1965-1978 | 3 | 3 | |
| 54 | Пісьмы, паведамленні Выканаўчага камітэта Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных і інш. М.Г. Дуброўскаму з запрашэннем прыняць удзел ва ўручэнні ўрадавых узнагарод і інш. | 1965-1978 | 8 | 8 | |
| 55 | Перапіска Выканаўчага камітэта Гродзенскага Савета дэпутатаў працоўных з М.Г. Дуброўскім наконт паляпшэння яго жыллёвых умоў.<br>Прыкладзена даведка Беларускага аддзялення Літфонда СССР аб праве М.Г. Дуброўскага на дадатковую плошчу. Л. 5 | 1969-1978 | 9 | 9 | |
| 56 | Паведамленні начальніка аддзела ўнутраных спраў г. Гродна М.Г. Дуброўскаму па яго заяве аб узбуджэнні крымінальнай і інш.<br>На адвароце аднаго з пісем - чарнавік адказу М.Г. Дуброўскага | 1975 | 2 | 2 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ М.Г. ДУБРОЎСКАГА** | | | | |
| 57 | Пасведчанні аб заканчэнні царкоўна-прыходскай школы ў вёсцы Каранец (цяпер у Крычаўскім раёне Магілёўскай вобласці) і двухкласнага вучылішча ў вёсцы Дамамерычы (цяпер у Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці) на імя Міхаіла Георгіевіча | 1909, 1911 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Маслакова (Дуброўскага) | | | | |
| 58 | Пратакол арганізацыйнага сходу студэнтаў беларусаў Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В.Я. Брусава з упамінаннем М.Г. Дуброўскага.<br>Арыгінал і машынапісная копія [1970-х гг.] | 1923 | 2 | 2 | |
| 59 | Дакументы аб пацвярджэнні працоўнай дзейнасці, стажу і інш. М.Г. Дуброўскага (пасведчанне Інстытута Беларускай культуры, даведка Інстытута працоўнага выхавання "Новая жизнь", заявы ў Цэнтральны [гістарычны] архіў БССР і інш.).<br>Арыгіналы і машынапісныя копіі [1970-х гг.] | 1926-1942, 1948-1976 | 16 | 16 | |
| 60 | Мандат на прадстаўніцтва М.Г. Дуброўскага ва Усесаюзнае таварыства пралетарскіх пісьменнікаў "Кузница", выпіска з пратакола камісіі па праверцы і чыстцы "Кузницы" (з упамінаннем М.Г. Дуброўскага) і інш.<br>Арыгінал і машынапісная копія, фотакопія артыкула 1928 г. | 1929-1930, [1950-я - 1970-я гг.] | 4 | 4 | |
| 61 | Даведка, выдадзеная М.Г. Дуброўскаму Маскоўскім абласным Саветам навуковых работнікаў аб ускладанні на яго кіраўніцтва кіна-радыё групай Усесаюзнага Камітэта Радыёвяшчання.<br>Арыгінал і машынапісная копія [1970-х гг.] | 1932 | 2 | 2 | |
| 62 | Зварот драмсекцыі ССП СССР да дырэкцыі Вялікага тэатра СССР з просьбай аказаць дапамогу М.Г. Дуброўскаму - аўтару падрыхтоўкі тэкста для оперы "Чапаев".<br>Арыгінал і машынапісная копія [1970-х гг.] | 1935 | 2 | 2 | |
| 63 | Пісьмо Маскоўскага Інстытута ўдасканалення настаўнікаў дырэктару Усесаюзнай бібліятэкі імя Леніна з просьбай падоўжыць тэрмін карыстання матэрыяламі спецзалу М.Г. Дуброўскаму | 1940 | 1 | 1 | |
| 64 | Пасведчанні да медалёў "За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг." і "За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг."<br>Прыкладзены запіскі М.Г. Дуброўскага і неўстаноўленай асобы са звесткамі аб узнагародах М.Г. Дуброўскага. Лл. 3-4<br>Дакументы моцна пашкоджаныя ў час пажару | [1940-я гг.], [1970-я гг.] | 4 | 4 | |
| 65 | Дакументы аб абароне кандыдацкай дысертацыі М.Г. Дуброўскага (водгукі, заявы, выпіскі з | 1954-1958 | 9 | 9 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | пратакола, хадайніцтва і інш.) | | | | |
| 66 | Заява М.Г. Дуброўскага ў партыйны камітэт Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы ў сувязі з загадам рэктара інстытута ад 15 верасня 1977 г. № 75 "Аб недобрасумленным выкананні сваёй працы".<br>Прыкладзены: пісьмо М.Г. Дуброўскага рэдактару часопіса "У дапамогу настаўніку "ад 22.08.1955 г. і адказ на яго і інш. Лл. 2-10 | 1955 - 1977 | 10 | 4 | |
| 67 | Дакументы М.Г. Дуброўскага на атрыманне персанальнай пенсіі рэспубліканскага і мясцовага значэння (біяграфічная даведка, заявы, хадайніцтва і інш.) | 1956-1980 | 31 | 23 | |
| 68 | Даведкі Гродзенскага аб'яднанага ваеннага камісарыята, праўлення СП БССР і інш. М.Г. Дуброўскаму аб пацвярджэнні розных фактаў яго біяграфіі і інш.<br>Арыгіналы і машынапісныя копіі | 1959-1976 | 7 | 7 | |
| 69 | Заявы М.Г. Дуброўскага начальніку Упраўлення міліцыі г. Гродна і Гродзенскай вобласці палкоўніку Елісееву, сакратару партыйнага камітэта міліцыі г. Гродна аб працы пашпартнага стала і інш. | 1961, 1975 | 2 | 2 | |
| 70 | Характарыстыкі дырэктара Брэцскага дзяржаўнага інстытута, рэдакцыі газеты "Сельская новь", домаўпраўлення № 4 г. Гродна і інш. на М.Г. Дуброўскага.<br>Машынапісныя копіі | 1972-1977 | 4 | 4 | |
| 71 | Віншаванне міністра абароны СССР А.А. Грэчкі з 30-годдзем Перамогі над гітлераўскай Германіяй і запрашэнне на мерапрыемства з нагоды ўзнагароды юбілейным медалём М.Г. Дуброўскаму | 1975 | 2 | 1 | |
| 72 | Ганаровая грамата ЛКСМ Беларусі М.Г. Дуброўскаму ў сувязі з 50-годдзем арганізацыі.<br>Натарыяльна завераная копія | 1976 | 1 | 1 | |
| 73 | Заявы М.Г. Дуброўскага ў Беларускае аддзяленне Літфонда СССР, СП БССР і інш. па асабістых пытаннях | 1976-1979 | 3 | 3 | |
| 74 | Рэкамендацыі П.С. Грышчанкі (машынапісная копія 1941 г.), А.Я. Жыркевіча, Д.С. Маркоўскага, І.Н. Шаіркі М.Г. Дуброўскаму для паступлення кандыдатам у члены КПСС | 1979, [1970-я гг.] | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 75 | Пасведчанне М.Г. Дуброўскаму Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В.Я. Брусава аб заканчэнні (1925) і выпіска з заліковай кніжкі. Машынапісныя копіі | [1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| 76 | Рашэнне Выканаўчага камітэта Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў аб узнагароджанні ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР медалём "Ветеран труда" (у тым ліку М.Г. Дуброўскага).<br>Выразка з газеты "Гродненская правда" № 141 ад 14.07.1980 г. | | 1 | 1 | |
| 77 | Аўтабіяграфія М.Г. Дуброўскага.<br>Аўтарызаваны машынапіс | 1980 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 78 | Запрашэнні рэдакцыі газет "Гродненская правда", "Сельская новь" і інш. М.Г. Дуброўскаму на нарады і з'езд рабселькораў і інш. | 1969-1973 | 8 | 8 | |
| 79 | Запрашэнні Палаца культуры тэкстыльшчыкаў г. Гродна і інш. М.Г. Дуброўскаму на лекцыю аб Міжнародным становішчы і інш. | 1971-1980 | 7 | 7 | |
| | * * * | | | | |
| 80 | Віншаванні рэдакцый газет "Гродненская правда", "Гродненский химик", "Літаратура і мастацтва", "Сельская новь" і інш. М.Г. Дуброўскаму з юбілеямі Машынапісныя копіі | 1967, 1972 | 5 | 5 | |
| 81 | Віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы ад родных, сяброў і знаёмых М.Г. Дуброўскаму з юбілеямі | 1967, 1972-[1982] | 7 | 7 | |
| 82 | Віншавальныя тэлеграмы ад праўлення СП БССР і СССР, В.У. Быкава, Г.М. Бураўкіна, М. Танка і інш. М.Г. Дуброўскаму з юбілеямі. | 1972, 1977 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 83 | Рэцэнзія І. Счаснага на артыкул М.Г. Дуброўскага "Вывучэнне пейзажа літаратурнага твора ў школе". Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскімі праўкамі | [1955] | 4 | 1 | |
| 84 | Артыкулы пра М.Г. Дуброўскага. | 1968-1977 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапісныя копіі газетных публікацый | | | | |
| | * * * | | | | |
| 85 | Фатаграфія М.Г. Дуброўскага, індывідуальная. Копія | [1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 86 | Фатаграфія М.Г. Дуброўскага ў групе з неўстаноўленымі асобамі | [1940-я гг.] | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 86 (восемдзесят шэсць)
спраў з № 1 па № 86 , 597 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла
2020 г.

Г.Б. Багамолава

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў

В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.